

# ТРАЦЦЯК
## Іван Іосіфавіч

Нарадзіўся ў 1930 годзе ў вёсцы Вейшычы Зэльвенскага раёна.

Свой працоўны шлях пачаў з дня ўтварэння калгаса. Вывучыўся на шафёра, і з 1955 года да выхаду на заслужаны адпачынак працаваў вадзіцелем у калгасе "Прагрэс". За час працы зарэкамендаваў сябе вопытным вадзіцелем, які ашчадна ставіцца да даручанай тэхнікі. Замацаваную за ім машыну ўтрымліваў заўсёды ў спраўным стане.

За больш чым 30-гадовы працоўны шлях калгаснага шафёра Траццяк І.І. шмат разоў узнагароджваўся праўленнем гаспадаркі за выдатную працу. Неаднаразова з'яўляўся пераможцам сацыялістычных спаборніцтваў. Яму прысвоены званні "Заслужаны калгаснік" і "Ударнік адзінаццатай пяцігодкі".

Пастановай праўлення калгаса, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 18 лютага 1985 г. пратакол №1 Траццяк І.І. занесены ў Кнігу Працоўнай Славы калгаса.